# «ПОД РОЖДЕСТВЕНСКИМ НЕБОМ»



**11 студзеня ў Магілёўскай абласной бібліятэцы імя Леніна адбылася творчая сустрэча «Под рождественским небом», на якой прагучалі вершы і проза, прысвечаныя калядным святам.**

А яшчэ – былі падведзены вынікі літаратурнага конкурсу, арганізаванага Магілёўскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі сумесна з Магілёўскай епархіяй Беларускай праваслаўнай царквы і МДУ ім. А.А.Куляшова.

Конкурс аб'яднаў людзей з розных куткоў Беларусі, ад Гродна да Краснаполля. На конкурс было даслана каля 150 работ. Прычым падзяліцца сваёй творчасцю спяшаліся як зусім юныя аўтары 8–10 гадоў, так і сталыя пісьменнікі. Для прафесійнага журы сапраўднай нечаканасцю стала такое багацце сапраўды моцных твораў, у якіх жыло свята, напоўненае добрымі справамі, міласэрнасцю, любоўю да блізкіх.

«Як паказаў гэты конкурс, у моладзевым асяроддзі адчуваецца прага да духоўнасці, – адзначыў старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Казека, – і таму такія конкурсы і творчыя сустрэчы становяцца асабліва важнымі. Бо аб духоўным, аб самым светлым і радасным можна і трэба казаць мовай мастацкіх твораў!»

Іерэй Алексій Навуменка, які ўзначальвае епархіяльны аддзел адукацыі і катэхезы, распавёў пра свята Раства Хрыстова, пра тое, што і творчасць павінна быць накіравана на духоўнае ачышчэнне і прасвятленне.

Пераможцы конкурсу былі ўзнагароджаны дыпломамі, граматамі, а таксама прызамі ад Магілёўскай епархіі БПЦ. Лепшыя творы ўвойдуць у электронны зборнік, які будзе ў адкрытым доступе ў інтэрнэце – каб можна было яшчэ не раз дакрануцца да каляднага настрою, наталіцца светлымі пачуццямі і падарыць сабе прыгажосць таленавітых твораў.

Прапануем вашай увазе некалькі вершаў пераможцаў конкурсу.

## Единство

*Ты слышишь тишины звенящий звук?*
*Земля в открытом космосе – ребенок*
*В кольце хранящих материнских рук,*
*Где каждый миг неимоверно долог.*
*Ты чувствуешь молитвы снежных гор,*
*Которым вторят звезды и пустыни,*
*Сплетая удивительный узор*
*Непостижимой красочной картины?*
*Раскрой свои ладони для тепла.*
*Расправь в плечах таящиеся крылья.*
*В твоей душе танцует чистота*
*В едином со вселенной вечном ритме.*

***Марыя ПАТАПКІНА, спецыяліст аддзела міжнародных сувязей МДУ імя А.А.Куляшова, дыплом І ступені.***

* * *

*Сегодня идем мы в храм.*
*Скажи мне, пожалуйста, мам,*
*Как смог один человек*
*Все изменить вовек:*
*Явить людям Божью суть,*
*Открыть перед ними путь*
*Без страха и без грехов,*
*Посредством обычных слов.*
*Как мог чудеса он творить*
*И как он сумел простить*
*Предательство и обман?*
*Скажи мне, пожалуйста, мам,*
*Как вынес он пытки, арест*
*И как взошел на крест*
*За то, чтоб могли мы жить,*
*Имея надежды нить?*

***Дзіяна СЦЕФАНЕНКА, вучаніца ДУА «Казельскі ВПК дзіцячы сад-сярэдняя школа Краснапольскага раёна», дыплом І ступені.***

* * *

*Неспешно падал снег сквозь чьи-то пальцы,*
*Струясь в фонарном свете, как родник.*
*И тот, кто не планировал остаться,*
*Решил не торопиться, задержаться,*
*Продлить хоть на секунду этот миг.*

*Снег опускался на уставшие дороги,*
*Проспекты, улицы, витрины и дома.*
*И в этот вечер показалось очень многим,*
*Что город, мокрый, серый и убогий,*
*Вдруг нежно обняла сама зима.*

*А главный зимний Гость ступает важно,*
*И молкнет суетливая молва.*
*Он здесь, чтоб разделить с душою каждой*
*В избушках и домах-многоэтажках*
*Свой благодатный дар – Дух Рождества.*

*Где побывал он – пахнет чудом, жгутся свечи.*
*Дитя под елкой чистит маме мандарин.*
*И каждому прохожему Гость шепчет,*
*Что в этот необычный светлый вечер*
*Никто живой не должен быть один.*

*И шепот проникает прямо в души:*
*Забыв про все тревоги и дела,*
*Стремятся люди, точно зная: нужно,*
*Чтоб волшебство случайно не нарушить,*
*Спешат с подарками к родным в свои дома.*

*Преображается унылый мрачный город,*
*Кружится в вальсе зимних праздничных забот.*
*И каждый рядом с тем, кто сердцу дорог,*
*И нет причин показывать свой норов,*
*А Светлый Гость вернется через год.*

***Марыя ІСАЕНКА, педагог-псіхолаг ВПК «Яслі-сад-сярэдняя школа ГУО №44 г.Магілёва», дыплом І ступені.***

* * *

*Когда-то первый человек*
*Впал в самый первый в мире грех –*
*И погрузился мир во мрак.*
*А было так...*
*Вот много-много зим и лет*
*Он ждал, когда вернется свет,*
*Но за веками шли века,*
*А света не было, пока*
*В простых яслях родиться смог*
*Спасенья луч – Младенец-Бог.*
*Над Вифлеемом в те года*
*Взошла звезда!..*
*Из мрака мир освобожден,*
*а грех великий искуплен.*
*Звезда горит, как жизни знак.*
*Да будет так!*

***Ягор ДЗЯМ'ЯНЧЫК, навучэнец УА «Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў», дыплом ІІ ступені.***